Мінсувязі выпускае ў абарачэнне паштовую марку «30-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай»

12 студзеня 2022 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «30-годдзе ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай». Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Беларусь. У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне на паштамце Мінска будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц.Непагодзіна». Дызайн паштовай маркі А.Мядзведзь, дызайн канверта «Першы дзень» і спецштэмпеля С.Цырулік.

Дыпламатычныя адносіны паміж Рэспублікай Беларусь і Кітайскай Народнай Рэспублікай усталяваны 20 студзеня 1992 года. Развіццё адносін з Кітаем – прыярытэтны напрамак знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Краіны рэгулярна абменьваюцца візітамі на вышэйшым і высокім узроўнях, вядуць актыўны міжпарламенцкі дыялог, ажыццяўляюць супрацоўніцтва па лініі Аддзел міжнародных сувязей Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Кітая – Адміністрацыя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, арганізуюць функцыянаванне Беларуска-Кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве, дынамічна развіваюць міжведамасныя і міжрэгіянальныя кантакты. Краіны паспяхова супрацоўнічаюць у міжнародных арганізацыях, аказваючы ўзаемную падтрымку па прынцыповых пытаннях.

РУП «Белпочта»

Source URL: *https://mpt.gov.by/news/10-01-2022-7661*